# ЗАКЛЮЧЭННЕ

савета па абароне дысертацый К 02.21.01 па дысертацыі Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны «Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава»

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца вучоная ступень.** Дысертацыя Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны «Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава» з'яўляецца кваліфікацыйнай навуковай работай і адпавядае галіне «філалагічныя навукі» і спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці.** У дысертацыі ўпершыню выяўлены кваліфікацыйныя і класіфікацыйныя параметры для ўпарадкавання моўнай рэпрэзентацыі праспекцыі і рэтраспекцыі, распрацаваны метадалагічныя прынцыпы і тэарэтычныя асновы іх даследавання; вызначаны, сістэматызаваны і класіфікаваны тыпы, віды праспекцыі і рэтраспекцыі, адносіны паміж праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі структурамі, прыёмы, маркеры і сродкі іх выражэння ў тэкстах мастацкай прозы У. Гніламёдава.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку прысуджана вучоная ступень.** Савет па абароне дысертацый К 02.21.01 прысуджае Дзігадзюк Валянціне Паўлаўне вучоную ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова **за:**

– распрацоўку метадалагічных прынцыпаў аналізу катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі; вызначэнне і сістэматызацыю лінгвістычных параметраў рэалізацыі гэтых катэгорый у літаратурна-мастацкім тэксце (сувязь з сюжэтна-кампазіцыйнымі асаблівасцямі тэксту, магчымасць моўнай рэпрэзентацыі і структурна-сэнсавай дыферэнцыяцыі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі);

– вызначэнне і класіфікацыю тыпаў праспекцыі (кампазіцыйна-тэкставая, сюжэтна-кампазіцыйная), відаў логіка-семантычных адносін паміж праспектыўнымі кампанентамі (тоеснасці, уключэння, перасячэння, неадпаведнасці), лексіка-граматычных маркераў праспекцыі (формы будучага часу і загаднага ладу дзеясловаў, мадальныя дзеясловы, формы дзеепрыметніка) і яе сюжэтна-кампазіцыйных маркераў (імя аўтара, загловак), значэнняў камунікатыўнай маркіроўкі (просьбы, прапановы, парады, забароны, пагрозы, сцвярджэння) і мадальна-сэнсавай маркіроўкі (пажадання, намеру, меркавання, магчымасці, пабуджэння, неабходнасці) праспектыўных кампанентаў і іх структурную арганізацыю;

– выяўленне і класіфікацыю тыпаў рэтраспекцыі (адсылачная, кампазіцыйна-тэкставая, тэкставая сюжэтная), відаў адсылачнай рэтраспекцыі (кантактная, дыстантная), адносін паміж рэтраспектыўнымі кампанентамі (тоеснасці і ўключэння); моўных сродкаў выражэння рэтраспекцыі (лексічны паўтор, сінанімія, лексемы з указаннем на час) і яе структурнай аргінізацыі;

– устанаўленне відаў кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі (пазатэкставая і фактычная), прыёмаў яе рэпрэзентацыі (намінацыя рэтраспектыўных падзей, інфармацыйнае дапаўненне фактаў, супастаўленне і параўнанне падзей, прыём прамой актуалізацыі мінулых падзей, прычынна-выніковыя адносіны паміж рэтраспектыўнымі падзеямі), моўнай рэпрэзентацыі кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі (лексемы з указаннем на час, лексічныя адзінкі рэтраспектыўнага значэння, формы дзеепрыметніка) і тэкставай сюжэтнай рэтраспекцыі.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання.** Навуковыя вынікі дысертацыі і яе апрацаваны і сістэматызаваны фактычны матэрыл могуць быць выкарыстаны пры выкладанні ва УВА дысцыплін «Беларускае мовазнаўства», «Сучасная беларуская літаратурная мова», «Стылістыка беларускай мовы», «Філалагічны аналіз тэксту», «Камунікатыўная лінгвістыка і тэксталогія»; пры падрыхтоўцы дыпломных работ і магістарскіх дысертацый, кваліфікацыйных навуковых работ, а таксама пры даследаванні літаратурна-мастацкіх твораў іншых аўтараў, пры аналізе мастацкіх катэгорый мадальнасці, лакатыўнасці, асобы аўтара і інш., пры далейшым вывучэнні асаблівасцей рэалізацыі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў іншых жанрах мастацкай літаратуры (паэзіі, драматургіі) і ў тэкстах іншых функцыянальных стыляў (навуковым, публіцыстычным і інш.).

Старшыня савета
па абароне дысертацый — В.Д.Старычонак

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — Д.В.Дзятко
12.10.2023